ного характера, способствовало бы и успеху конституционализации национальной правовой системы.

Для развития конституционного регулирования в условиях современных государств характерны следующие тенденции:

- Повышение уровня и качества конституционно-правового регулирования.

- Усиление гибкости конституционного воздействия на социальные связи, т.е. расширением стимулирующей, мотивационной роли конституционных норм и принципов.

- Возрастание интегрирующей роли конституционного регулирования в национальной правовой системе.

- Усиление роли конституционного регулирования в воплощении конституционных ценностей – равенства, справедливости, плюрализма, уважения к личности.

Признавая возрастание значимости и ценности конституционного регулирования в условиях современных государства, следует, как представляется, согласиться с позицией У. Бернама, высказанной в отношении правовой системы США, но актуальной для любого государства: «Конституционное право пропитывает собой практически любую отрасль права» [4, с.531]. А потому понимание, реформирование, развитие правовой системы в своей основе имеет конституционное регулирование.

**Библиографические ссылки**

1. Шупицкая, О.Н. Конституционно-правовое регулирование: понятие и предмет / О.Н. Шупицкая // Современное право. – 2018. – № 10. – С.28-33.

2. Крусс, В.И. Конституционализация права: основы теории: монография / В.И. Крусс. – М.: Норма: ИНФРА-М, 2019. – 240с.

3. Бернам Уильям. Правовая система США. 3-й выпуск. – М.: «Новая юстиция», 2006. – 1266 с.

***Шчэрбік Дзітрый Васільевіч***

## КАНСТЫТУЦЫЯ 3 МАЯ 1791 г. ЯК ПРЫКЛАД РЭАЛІЗАЦЫІ ІДЭЙ ПАДВОЕНЫХ КРЫНІЦАЎ ЛЕГІТЫМНАСЦІ ЎЛАДЫ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт, shcherbikdv@bsu.by

***Анатацыя.*** У публікацыі даследуюцца традыцыі легітымізацыі ўлады, якія былі распаўсюджаныя ў палітыка-прававой думцы Рэчы Паспалітай. Аўтар вылучае рэспубліканскую і манархічную канцэпцыі ўлады, апісвае іх развіццё на працягу XVII-XVIII стагоддзяў.

Ажыццяўляецца аналіз Канстытуцыі ад 3 мая 1791 г. праз прызму вылучэння ў яе тэксце супярэчлівага ўвасаблення дадзеных падыходаў.

***Ключавыя словы:*** шляхецкі рэспубліканізм; рэформы ў Рэчы Паспалітай; Канстытуцыя Рэчы Паспалітай; легітымізацыя ўлады; крыніца ўлады.

Прынянцце канстытуцыі заўжды суправаджаецца значнымі грамадскімі дэбатамі. Падобна дыскусіі, якая мае месца ў апошнія гады ў Рэспубліцы Беларусь, больш за дзвесце год таму на нашых землях, якія ў тыя часы ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай, адбываліся гарачыя спрэчкі наконт пытанняў уладкавання дзяржаўнай улады, месца і ролі кіраўніка дзяржавы сярод іншых вышэйшых інстытутаў дзяржаўнага ладу.

Канстытуцыя 3 мая 1791 г. стала ў гэтым сэнсе вынікам спалучэння і кампрамісу цалкам розных падыходаў і канцэпцый рэфармавання дзяржавы. Кансерватыўная частка насельніцтва, прадстаўнікі якой апелявалі да традыцый сармацкага рэспубліканізму, натхнялася ідэямі часоў рокашу Любамірскага ды творамі А.М.Фрэдры і С.Г.Любамірскага, прагла захавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і апелявала да іншаземных урадаў у пытанні яго абароны. Рэакцыянерам супрацьстаялі два праекты рэформаў. Першы накірунак ў новых асветніцкіх шатах прадстаўляў стары праект умацавання дзяржаўнага ладу праз узмацненне пазіцыі манарха. Працягваючы ідэі П.Скаргі і К. Варшэвіцкага канца XVI – пач. XVII стст., Яна Казіміра, А.Алізароўскага ды Л.Апалінскага з другой паловы XVII ст., развіваючы намеры па правядзенню рэформаў каралёў з дынастыі Веттынаў, ён быў накіраваная на пераўтварэнне выбарнай манархіі ў спадчынную, фармаванне кабінетнага (міністэрскага) праўлення пад кіраўніцтвам караля, скасавання liberum veto ды абмежавання правоў сейма падатковымі пытаннямі і інш.

Другі падыход базаваўся на ідэях асучасненага тэрміналогіяй асветніцтва рэспубліканізму, якія сваімі каранямі зыходзілі да рокашу Зэбжыдоўскага пачатку XVII ст., поглядаў С. Дунін-Карвіцкага і С. Ляшчынскага пачатку XVIII ст. ды С. Канарскага сярэдзіны XVIII ст. У яго падмурку ляжалі ідэі абмежавання ці нават скасаванне liberum veto, далейшага абмежавання правоў манарха праз адабранне правоў надзялення ўрадавымі ды вайсковымі пасадамі ды каралеўшчызнамі, абмежавання правоў сената, пераўтварэння сейма ў заўжды “гатовую” або пастаянна функцыянуючую інстытуцыю, ператварэнне яго ў вышэйшую апеляцыйную судовую інстанцыю, ды нават фармаванне сеймавага камісійнага (радавага) кіравання. У сацыяльнай сферы

рэспубліканцы імкнуліся да пазбаўлення выбарчых правоў “галоты” або беззямельнай шляхты, якая на іх думку выступала падкупленым магнатэрыяй ці каралёмнеадукаваным натоўпам. Іх ідэал - Цэнзавы Сейм з заможнай шляхты і кааптаваных у яе кола мяшчанаў як найвышэйшы орган дзяржаўнай улады.

Праблема Рэчы Паспалітай была ў тым, што хоць большая частка шляхты выступала за рэформы, але аніводная з партый не мела падтрымкі пераважнай большасці, з-за чаго амаль усё XVIII ст. прыхільнікі партый зацята змагаліся між сабой, зрываючы сеймы, распачынаючы з замежнай падтрымкай грамадзянскія войны. Пры неабходнасці кожная з рэфарматарскіх партый з’ядноўвалася з кансерватарамі ды станавілася на апазіцыйную сапернікам пазіцыю захавання дзейснага становішча, што пры дапамозе замежнага ўмяшальніцтва забяспечвала захаванне “бязладдзя” ў Рэчы Паспалітай, чым і былі задаволены замежныя ўрады.

Сітуацыя пачала змяняцца ва ўмовах Чатырохгадовага Сейма, калі прыдворная і патрыятычная партыі, ва ўмовах безразважнай пераарыентацыі абедзвюх груповак на Прусію, паспрабавалі выкарыстаць міжнародную сітуацыю дзеля рэформаў. Праект Канстытуцыі (“*Ustawa rządowa*”) распрацоўваўся як вынік кампрамісу паміж памяркоўных рэспубліканцаў на чале з І.Патоцкім, радыкальных рэспубліканцаў на чале з Г.Калантаем ды прыдворнай партыі, чый уплыў значна пашырыўся пасля давыбараў ў Сейм. У канстытуцыйнай працы ад апошняй удзельнічаў каралеўскі сакратар італьянец Сцыпіёні П’ятоллі ды сам манарх Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Першапачатковы праект распрацаваны рэспубліканцамі фактычна адхіліў бы ад ўлады манарха, бо прадугледжваў выбарнасць усіх без выключэнняў земскіх ды павятовых чыноўнікаў сеймікамі, а міністраў ды сенатараў на “заўжды гатовым” Сейме, а таксама патрабаваў кантроля выбарцаў над сваімі дэпутатамі [1, с.224, 226].

У сваю чаргу меркаванні караля былі засяроджаны на пабудове “добра упарадкаванай” (“асветніцкай”) манархіі з спадчынным тронам для Панятоўскіх, падпарадкаванні манарху выканаўчай улады, ліквідацыі liberum veto і скасаванні адказнасці дэпутатаў перад выбаршчыкамі [1, с. 226].

Выніковы варыянт стаўся кампрамісным. Ад самага пачатку арыгінальнай асаблівасцю Канстытуцыі з’яўлялася яе ўкаранёнасць у традыцыі дзяржаўна-прававога мыслення, характэрныя менавіта для Рэчы Паспалітай. Аб гэтым сведчылі першыя словы прэамбулы: “У Імя Бога ў Тройцы Святой адзінага …”. Канстытуцыя тым самым спасылалася на Бога ў характэрнай для хрысціянска-каталіцкай

традыцыі фармулёўцы. Яе творцы ставілі Бога на першае месца ў пытанні вырашэнні грамадскіх спраў, аддавалі яму ўсе жыццё народа і дзяржаву пад апеку [2, с.113]. Дадзены падыход радыкальна адрозніваўся ад цалкам свецкай Канстытуцыі Францыі 1791 г., ды канстытуцыйных дакументаў ЗША, у якіх, як у Дэкларацыі незалежнасці 1776 г., хоць і былі спасылкі на “Творцу”, але шматлікасць веравызнанняў не дазваляла дакладна сфармуляваць дадзеную прывязку.

Другая асаблівасць заключалася ў характэрнай для Рэчы Паспалітай арыентацыі на традыцыйную падвоеную легітымнасць улады. Яна была сфармуляваная адразу за ўпамянутым invocatio Dei: “.. Станіслаў Аўгуст з Божай ласкі і Волі Народа…”. Першая частка фармулёўкі выразна кантраставала з адназначнымі спасылкамі амерыканскай і французскай канстытуцый на народ, як адзіную крыніцу ўлады. Яшчэ больш падкрэслівала боскую легітымацыю ўлады абвяшчэнне асобы манарха “свяшчэннай і недатыкальнай” (раздз.VII). С. Сташыц гэтую традыцыйную і сягаючую часоў “залатога веку” [3] пазіцыю выказаў наступным чынам: “толькі тая ўлада паходзіць ад Бога, якую нам народ дае” [1, с.86].

Канстытуцыя выпраўляла сапсаваную за часы шляхецкай дэмакратычнай анархіі традыцыю і яшчэ больш умацоўвала дадзеную падвоенасць легітымацыі ўлады ўсталяваўшы дзедзічнасць трону і ўказаўшы на яго перадачу ва ўлонне дынастыі Веттынаў. Спасылка на легітымную дынастыю, якая ў вачах усей манархічнай Еўропы мела як і астатнія каралеўскія дынастыі боскую легітымацыю, павінна было як умацаваць манархічную ўладу ў Рэчы Паспалітай, так і падвысіць прэстыж каралеўскай ўлады, зрабіць яе роўнай у асяроддзі суседніх манархій.

Указанне ж Канстытуцыі на легітымнасць манарха з “волі народа”, а таксама палажэнні пра тое, што “усякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак у воле народа” (раздз.V) падкрэслівалі асаблівасць палітычнай думкі жыхароў Рэчы Паспалітай, адрозніваючы яе ад выключна манархічных канцэпцый асветніцкага абсалютызму распаўсюджаных у Расіі ці Аўстрыі.

Спроба на новым этапе прыйсці да гарманізацыі прынцыпаў “Каралеўскай Польшчы” ды “Шляхецкай Польшчы” адлюстравалася і ў рэформе інстытута выканаўчай улады, само паняцце якой адсылала да асветніцкіх шатаў новых часоў. Падвоеная легітымнасць улады выяўлялася ў парадку функцыянавання ўраду. Прызначаныя паводле Канстытуцыі манархам чальцы ўраду - міністры і сакратары Варты законаў (*Straż Praw)* - былі адказныя перад Сеймам, які мог прыцягнуць

іх да адказнасці перад канстытуцыйным ды парламенцкім трыбуналамі. Урад на чале з каралём вызначаў асноўныя накірункі палітыкі дзяржавы, ажыццяўляў кантроль за дзейнасцю мясцовых адміністрацый ды судоў, атрымліваючы рапарты аб іх дзейнасці, аднак адміністраванне выканаўчай уладай знаходзілася ў руках прызначаных Сеймам камісій, якія пры гэтым павінны былі даваць справаздачы аб сваёй дзейнасці ў Варту законаў ды выконваць яе рашэнні (раздз.IX Закону аб скарбавай камісіі Рэчы Паспалітай ад 29.10.1791 г.).

Калі ўлічыць, што рашэнні ва Ўрадзе прымаліся каралём на падмурку парадаў чальцоў Варты, і для іх вынясення было дастаткова пры нармальным збегу абставін подпісаў караля і аднаго з міністраў, за які апошні нёс, прынамсі, адказнасць перад Сеймам, то становіцца відавочным значнае ўмацаванне пазіцыі манарха паводле прынятай Канстытуцыі. І хоць раздзелы канстытуцыйнага акта пра ўладу караля і выканаўчую ўладу больш нагадвалі не спіс прававых нормаў, а дактрынальныя абгрунтаванні і тлумачэнні, усё роўна падобныя змены аказалася занадта радыкальнымі для значнай часткі прадстаўнікоў шляхецкага стану Рэчы Паспалітай, якія дзеля аднаўлення статус-кво дарэмна паспадзяваліся і звярнуліся, як звыклі, па замежную дапамогу, атрымаўшы на гэты раз не падтрымку ва ўнутрыпалітычнай барацьбе, але Другі падзел і амаль поўнае знішчэнне дзяржавы. Якое, адзначым, было ўжо не за гарамі.

Такім чынам, спроба ўдасканаліць дзяржаўны лад на падмурку аднаўлення сапсаваных на працягу XVII-XVIII стст. традыцыйных ідэй “мешанага ўрада” (forma mixta) або гарманічнага ўзаемадзеяння прынцыпаў дзейснай каралеўскай улады ды шляхецкай вольнасці і асветніцкіх ідэй падзела ўладаў аказалася нерэалізаванай. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. пры гэтым стала адным з апошніх у шэрагу канстытуцыйных дакументаў Новага часу сягаючых ідэяў сярэднявечнага дзяржаўнага ладу ды адным з першых актаў, якія дарэмна спрабавалі замацаваць падвоеную легітымнасць улады, спалучыць двух суверэнаў – манарха з ласкі Божай ды Народ.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Kucharczyk, G. Polska myśl polityczna do roku 1939 / G. Kucharczyk. – Dębogóra : Wyd. Dębogóra, 2011. – 550 s.
2. Bała, P. Pod wezwaniem Boga czy narodu. Religia a ustrój - studium przypadku polskich konstytucji / P. Bała. - Warszawa : Wyd. Von Borowiecky, 2010. - 359 s.
3. Bartyzel, J. Polska doktryna ustrojowa [Электронный ресурс] / J. Bartyzel // Organizacja Monarchistów Polskich. – Режим доступа: http://www.legitymizm.org/polska-doktryna-ustrojowa. – Дата доступа: 8.10.2021.